Камісія па справах душпастырства моладзі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
10.02.2019 00:00



Жыць Евангеллем. Першы Сінод Гродзенскай дыяцэзіі Маладосць мае вельмі важнае значэнне. Яна з’яўляецца нібы падмуркам, на які павінна абапірацца ўсё будаванне жыцця чалавека і які часам у значнай ступені вырашае не толькі яго будучыню, але нават вечнасць. Маладыя сёння працуюць на “рынку” канкурыруючых светапоглядаў. Сучасны свет мае мноства займальных прапаноў для асоб, што робяць першыя крокі ў дарослае жыццё, а “аферты” Касцёла неаднойчы ўспрымаюцца моладдзю як незахапляльныя і нават устарэлыя. Малады чалавек часта сутыкаецца з сур’ёзнымі праблемамі, калі стараеца неяк адшукаць сябе ў гэтым свеце. Каб выйсці на добрую дарогу, яму неабходны аўтарытэты, правадыры, сапраўдныя арыенціры, якія прывядуць да праўды.

Першая задача камісіі – адэкватная дыягностыка: якім на самой справе з’яўляецца малады чалавек, якія мае самыя глыбокія жаданні, у якіх рэаліях жыве, з якімі рызыкамі і праблемамі сутыкаецца. Правільны дыягназ павінен прывесці да канкрэтных указанняў, якія – мы спадзяёмся – будуць карыснымі для маладых людзей у раскрыцці іх унікальнай ідэнтычнасці ў грамадстве і ў свеце, а таксама аблегчаць распазнанне паклікання, якім кожнага з іх адарыў Стварыцель.

Чарговым крокам стане апрацоўка фармацыйнай праграмы, якая будзе фарміраваць маладога чалавека ў духу евангельскіх каштоўнасцей, а таксама прапануе новыя рашэнні, беручы пад увагу бягучую сітуацыю і патрэбы маладых людзей у розных сферах жыцця.

Іншай важнай задачай сінадальнай камісіі з’яўляецца падрыхтоўка адпаведнай падтрымкі для душпастыраў моладзі, каб маглі эфектыўна і ўпэўнена накіроўваць маладое пакаленне да Езуса. Бясспрэчна, усё гэта павінна дапамагчы абудзіць у маладзёнаў эклезіяльную свядомасць і нарадзіць жаданне стварыць супольнасць ды несці адказнасць за Касцёл.

Камісія па справах душпастырства моладзі з’яўляецца доказам таго, што за сінадальным сталом павінны быць прадстаўнікі маладога пакалення. Моладзь – надзея ўсяго Касцёла. Такім чынам, маладыя людзі нашай дыяцэзіі – калі толькі захочуць – змогуць вельмі станоўча паўплываць на абмеркаванні Сінода, каб праз некалькі гадоў

уключыцца ў евангелізацыйную місію дыяцэзіяльнага Касцёла.

Кожны малады чалавек, які клапоціцца пра развіццё і дабрабыт хрысціянскай супольнасці, мае права гаварыць і можа адчуваць сябе ўдзельнікам “навяртання”, да якога закліканы ўвесь Касцёл праз трываючы І Сінод Гродзенскай дыяцэзіі.